**Краўцоў** Вячаслаў Рыгоравіч // Памяць. Чашніцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: М. Ц. Дробыш [і інш.] ; уклад. Н. Т. Кіндзяева ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Беларуская навука, 1997. — С. 465.

## КРАЎЦОЎ ВЯЧАСЛАЎ РЫГОРАВІЧ

Нарадзіўся ў 1964 г. 27 сакавіка ў в. Навасёлкі Талачынскага раёна Віцебскай вобл. Беларус. Член ВЛКСМ. Маці, Любоў Мікалаеўна, працуе ў магазіне, бацька, Рыгор Апанасавіч, сталяр у будаўнічым упраўленні Лукомскай ДРЭС. У 1979 г. Вячаслаў скончыў 8 класаў сярэдняй школы № 1 г. Новалукомля, у 1982 г. ПТВ № 83, атрымаў спецыяльнасць электразваршчыка. Працаваў у будаўнічым упраўленні Лукомскай ДРЭС. У маі 1983 г. прызваны ў Савецкую Армію Чашніцкім РВК. Служыў у Афганістане. Радавы В. Р. Краўцоў загінуў 6 красавіка 1984 г. Пахаваны ў в. Старыя Лаўкі Чашніцкага раёна. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

### З пісьмаў В. Р. Краўцова родным

*...Трапіў я выдатна, землякоў – мора. Двое знаёмых з горада: адзін з вучылішча, адзін з Лісічына. Астатнія з Наваполацка, і гэтак – беларус на беларусе.*

*...Учора быў на канцэрце. Прыязджаў наш беларускі ваенны ансамбль. Наогул, тут часта канцэрты. Прыязджалі Эдзіта П’еха, Роза Рымбаева, розныя ансамблі. Наогул, тут нас не забываюць, кожны дзень кінафільмы. Праз 4 дні мне споўніцца 20 год. Так! Як хутка ляціць час!*

*...Сёння сустрэў яшчэ аднаго земляка з Чашнік. Сёння ў нас было весела, сабралася 5 землякоў. Прынеслі розных прысмакаў, гатавалі чай. Тут ёсць такія рэчы, што, калі б іх выкінулі ў нас у магазіне, задавілі б у чарзе. Вы што-небудзь чулі аб страве з чарнасліву ці яшчэ што-небудзь?..*